6. Хофмайстер Х. Вера и знание. Попытка Канта говорить о Боге. //Вера и знание. Соотношение понятий в классической немецкой философии. С - Петербург, 2008. – С.108 – 118.

*Бабко А.І.* **Філасофія ў сістэме духоўных формаў: спроба пастаноўкі праблемы ў сучасным культурным і міжкультурным кантэксце**

Той момант, што ўсе формы, у якіх здзяйсняецца духоўнае жыццё людзей, глыбока ўзаемазвязаны, што яны ўзаемадзейнічаюць і ўплываюць адна на адну, падаецца бясспрэчным і нават трывіяльным. Несумненна і тое, што іх узаемадзеянне мае няпросты, супярэчлівы характар. У пэўных гістарычных умовах – калі дамінаванне адной духоўнай формы набывае татальны характар і ператвараецца ў перашкоду для развіцця іншых – напружанне ў іх стасунках рэзка ўзмацняецца, выклікаючы вострыя, драматычныя сутыкненні паміж імі. У выпадку іх інстытуцыяналізацыі гэтыя сутыкненні выяўляюцца ў калізіях паміж адпаведнымі сацыяльнымі інстытуцыямі і пры ўсіх абставінах – у міжасобасных ці ўнутраных, асобасных канфліктах.

Але якая б духоўная форма – мастацтва, рэлігія, навука ці нейкая іншая – ні дамінавала ў духоўным жыцці індывіда і грамадства, філасофія заўсёды займае ў ім адмысловае месца. Дзякуючы сваёй рэфлексіўнай, крытычнай і сінтэтычнай натуры, яна звернута да кожнага з яго сегментаў, і кожны з іх мае ў ёй усвядомлены ці неўсвядомлены, яўны ці няяўны падмурак. Яснае і выразнае ўсведамленне гэтай грунтоўнай ролі філасофіі характэрна найперш для крызісных, рэвалюцыйных, складаных гістарычных эпох. Інтэнсіўны філасофскі пошук з’яўляецца істотнай іх адзнакай: вострыя супярэчнасці ў духоўным жыцці грамадства ўвогуле ці пэўнай яго сферы патрабуюць асэнсавання глыбокіх, падставовых яго структур, а гэта задача філасофскага ўзроўню.

Сучасная эпоха выступае ў гэтым плане як надзвычай спрыяльная для філасофскай рэфлексіі: адзначаная інтэнсіфікацыяй усіх сацыяльных працэсаў, абвастрэннем глабальных праблем, шматлікімі крызіснымі з’явамі, калізіямі і канфліктамі лакальнага і рэгіянальнага ўзроўню і маштабу, яна не можа не стымуляваць творчую і крытычную філасофскую думку. Будзіць яе і не дазваляе ёй заспакоіцца і сучасая культурная сітуацыя, адметнасць якой – у

наяўнасці супрацьлеглых кірункаў яе развіцця і ў вострых калізіях паміж імі: з аднаго боку, гэта звязаны з глабалізацыйнымі працэсамі момант стандартызацыі, уніфікацыі, паяднання, а з іншага, – памкненне да адметнасці, да захавання нацыянальна-культурнай ідэнтычнасці, да развіцця нацыянальнай культуры.

Адметнасць сучаснага культурнага кантэксту выяўляецца таксама і ва ўскладненні ўзаемадачыненняў паміж рознымі сегментамі культуры, што непасрэдна закранае філасофію і з'яўляецца выклікам для яе. Справа ў тым, што ў сучасных умовах філасофская рэфлексія знаходзіцца ў напружаных адносінах са сваім духоўным атачэннем. Так, навука заняла настолькі трывалыя культурныя пазіцыі, што можа абыякава ставіцца да спроб яе легітымацыі, якія рабіліся ў абсягу філасофіі (калі карыстацца слоўнікам, прапанаваным прадстаўнікамі постмадэрнага мыслення, дык можна сказаць, што навуковы пошук не мае патрэбы ў вялікіх расповедах, якія прапаноўвае ёй філасофія). Больш за тое, сітуацыя ва ўзаемадачыненнях гэтых дзвюх духоўных формаў складваецца так, што філасофіі неабходна паклапаціцца пра сваю ўласную легітымацыю. Гэта звязана і з культурным статусам навукі ва ўмовах тэхнагеннай цывілізацыі, і з вынікамі інтэнсіўнага навуковага пошуку. У такіх варунках можа падацца, што існуюць падставы разглядаць навуку ў пэўным сэнсе як канкурэнтку філасофіі, як той духоўны асяродак, дзе мы маем найбольш эфектыўныя сродкі для вырашэння праблем, якія традыцыйна лічыліся кампетэнцыяй апошняй (тэарэтычнае апісанне свету ў цэлым, праблема свядомасці і г.д.).

Не менш напружаная сітуацыя назіраецца ў сучасных умовах і ва ўзаемадачыненнях філасофіі і рэлігіі. Прафесар Кёльнскага ўніверсітэта К.Бікман лічыць, што ў XIX і XX стагоддзях у заходняй культуры яны ўсё больш разыходзяцца паміж сабой (хоць у шматлікіх еўрапейскіх і пазаеўрапейскіх духоўных традыцыях мелі месца дачыненні, у якіх выяўляліся іх глыбокія ўзаемасувязі і іх узаемадапаўняльны характар) [1, с. 11]. Як паказвае К.Бікман, у пазаеўрапейскай культурнай прасторы дадзеная тэндэнцыя захоўваецца і зараз; таму гэты разлад выступае ў сённяшнім свеце, у свеце, які выяўляе ўсё больш шчыльную ўнутраную еднасць, як грунтоўная праблема і як выклік для філасофіі [1, с. 12]. Неабходнасць уважлівага і сур'ёзнага аналізу згаданай праблемы

абумоўліваецца яе істотнай значнасцю ў кантэксце міжкультурнага, міжцывілізацыйнага дыялогу (хоць яна выступае як дастаткова рэлевантная і ў еўрапейскай культурнай прасторы, у цэнтрах якой мы сутыкаемся з рэабілітацыяй як хрысціянскай, так і юдэйскай духоўных традыцый) [1, с. 17].

Складаны, супярэчлівы характар працэсаў, што адбываюцца ў сучаснай культуры, выяўляецца не толькі ў стасунках паміж яе сегментамі, але і ў абсягу кожнага з іх. Так, сучасная філасофія, найвыразнейшым чынам артыкулюючы (вуснамі прадстаўнікоў постмадэрнізму) прынцып адметнасці і плённай рознасці, разам з тым здзяйсняе яго, ўражваючы шматлікасцю і разнастайнасцю плыняў, падыходаў і кірункаў. Адчуваецца ў ёй, аднак, і пэўная стомленасць ад гэтай неагляднай разнастайнасці, а таксама патрэба ў сінтэтычным падыходзе да філасофскіх праблем.

Характэрныя для сучаснай культурнай сітуацыі супярэчлівыя тэндэнцыі назіраюцца і ў галіне навукі. Разгледзім у якасці прыкладу фізіку. Артыкулюючы праблему суадносінаў бесперапыннага і дыскрэтнага, яна ўжо ў сваім змесце выяўляе адзначаныя вышэй грунтоўныя, стратэгічныя кірункі разгортвання сучасных культурных працэсаў. З іншага боку, у сучасны культурны кантэкст надзвычай пасуе адкрыты, незавершаны характар квантава-рэлятывісцкай карціны свету. Узятыя паасобку фізічныя тэорыі, на якіх яна грунтуецца, з’яўляюцца несупярэчлівымі. Але ўсе спробы іх спалучэння ў адзінае цэлае прыводзілі да супярэчлівых вынікаў [2, с. 357]. Згаданыя тэорыі не паддаюцца пакуль што сінтэзу, нібы жадаючы сцвердзіць такі любы тэарэтыкам постмадэрнізму прынцып рознасці – у дадзеным выпадку рознасці падыходаў да фізічнай рэальнасці, да прыродных з’яў. Патрэба ў сінтэзе грунтоўных тэорый адчуваецца ў сучаснай фізіцы, аднак, надзвычай востра: памкненне да сінтэзу, уніфікацыі, паяднання выступае як яе найяскравейшая характарыстыка [2, с. 363 – 364].

Падобная сітуацыя назіраецца і ў рамках іншых духоўных формаў. Сучасны французскі філосаф Д.Параш’я лічыць яе непрымальнай. Ён даводзіць (выкарыстоўваючы метафарычныя моўныя сродкі), што яна паўстала праз дысфункцыю тых культурных апаратараў, што адказваюць за сінтэз паасобных уяўленняў у адзінае цэлае [2, с. 1 – 2]. Неабходна адзначыць, што

патрэба ў задзейнічанні "сінтэтычных апаратараў" у сучаснай культуры сапраўды існуе. Але яна дапаўняецца ўсведамленнем каштоўнасці і значнасці адметнага і адмысловага. Арганічнае спалучэнне "сінтэтычных" і "аналітычных" механізмаў культуратворчасці – гэта найбольш эфектыўная схема развіцця культуры ў цэлым, кожнай з яе сфер і ўзаемадачыненняў паміж імі.

Такім чынам, у сучаснай культурнай сітуацыі складаныя, супярэчлівыя і шматпланавыя дачыненні філасофіі і іншых духоўных формаў набываюць новыя адценні і аспекты, новыя імпульсы для свайго разгортвання і ўзбагачэння. Асаблівая адказнасць за плённае развіццё гэтых дачыненняў ляжыць на філасофіі, да грунтоўных задач якой належыць распрацоўка яго тэарэтычных мадэляў, падстаў і прынцыпаў. Дадзеная задача з'яўляецца ў сучасных умовах, як паказана вышэй, асабліва актуальнай. Гэта зусім не азначае, аднак, што філасофія мае права ігнараваць уздзеянне іншых сегментаў культуры на яе самую: важнай умовай выніковасці яе дыялога з усімі асяродкамі духоўнасці з'яўляецца разуменне іх узаемнай значнасці. Філасофія не мае права ні на пыхлівае, ні на рабалепнае стаўленне да іншых духоўных формаў, бо без ўзаемадзеяння з імі філасофскі пошук страціў бы істотныя імпульсы для свайго самаразгортвання.

Литература:

1.Bickmann, C. Vorwort. Einführung in die Themenstellung / C.Bickmann. – Religion und Philosophie im Widerstreit? Internationaler Kongress an der Universität zu Köln, 13. – 16. Juli 2006. – C.Bickmann, M.Witz, H.-J.Scheidgen (Hrsg.). – Nordhausen: Traugott Bautz, 2008. – S. 11 – 19.

2.Parrochia, D. Les grandes révolutions scientifiques du XX siècle / D. Parrochia. – Paris: Presses Universitaires de France, 1997. – 434 p.

## *Берков В.Ф.* Что значит понимать текст?

Вопрос, обозначенный заглавием данной работы, кажется, на первый взгляд, очень простым. Однако он дискутируется уже не одно десятилетие и сегодня не имеет однозначного решения. Проблематика, группирующаяся вокруг понятия понимания, является важнейшим источником появления и существования специальной философско-филологической дисциплины – герменевтики (греч. hermenes – разъясняю, истолковываю).